**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за чэрвень 2019 г.

У чэрвені ў публічных бібліятэках ДУК стартаваў раённы конкурс летняга чытання «Летом с книгой я дружу». У рамках конкурсу бібліятэкі праводзяць мерапрыемствы для дзяцей і падлеткаў.

## Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу летняга чытання «Летом с книгой я дружу»

***1 чэрвеня***

Спартыўна-музычнае свята «Вось першы чэрвеньскі дзень - дзень абароны дзяцей» пачалося з конкурсу малюнкаў на асфальце. Далей з дзецьмі весяліліся казачныя героі Смеяшка і Клоун. Яны чыталі вершы, загадвалі загадкі, задавалі каверзныя пытанні, праводзілі віктарыны. Працягнулі свята выступленнем дзіцячай вакальнай групы Дома культуры. Гучалі песні «Дзяцінства», «Маленькая краіна», «Мы маленькія дзеці». У завяршэнні мерапрыемства адзначаны пераможцы конкурсу малюнкаў.

Навасёлкаўская ПБ, 47 чал.

***7 чэрвеня***

Літаратурна-гульнявая праграма «Пушкинские забавы» сабрала дзяцей рознага ўзросту. Прысутныя адправіліся ў казачны свет Аляксандра Пушкіна, дзе гасцявалі ў шматлікіх казках, удзельнічалі ў віктарыне «Знаешь ли ты сказки Пушкина?», імправізавалі і ўжываліся ў ролі яго герояў, адгадвалі казкі па ілюстрацыях, гулялі ў інтэлектуальныя гульні, чыталі вершы. Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з кніжнай выставай «Идут века, но гении бессмертны». Напрыканцы мерапрыемтсва дзеці паглядзелі «Сказку о золотом петушке».

Дзівінскі філіял, 65 чал.

***13 чэрвеня***

Лета ў бібліятэцы пачалося са святочнай конкурсна-гульнявой праграмы «Открываем летние чтения». Юныя наведвальнікі прынялі ўдзел у гульнявых конкурсах і віктарыне. Паміж сабой спаборнічалі тры атрады. Вялі гульнявую праграму два клоуна і Мальвіна. Закончылася мерапрыемства дыскатэкай, дзе казачныя героі танцавалі разам з дзецьмі.

Павіццеўская ПБ, 30 чал.

***12 чэрвеня***

У час літаратурнай прагулкі «По книжным тропинкам лета» юныя карыстальнікі бібліятэкі вандравалі па кніжных сцежках, робячы карысныя прыпынкі «Азбука народной мудрости», «Царство пернатых», «Цветочная поляна», «Лесная дискотека», «Витамины для детей». Прысутныя ўдзельнічалі ў літаратурных конкурсах і танцавальным батле, выконвалі

творчыя заданні і адказвалі на пытанні віктарыны. Дзецям прэзентавана кніжна-ілюстраваная выстава «Секреты книжного лета» і ўручаны запрашэнні на мерапрыемствы, якія адбудуцца ў рамках конкурса летняга чытання «Каникулы в библиотеке».

Гарадзецкі філіял, 60 чал.

***19 чэрвеня***

Літаратурна-гульнявая праграма «За 90 дней лета вокруг света!» сабрала дзяцей на летняй пляцоўцы каля бібліятэцы. Прысутныя разгадвалі загадкі, удзельнічалі ў віктарыне, складалі словы са слова «БИБЛИОТЕКА». Удзельнікі знаёміліся з кнігамі выставы, а напрыканцы мерапрыемства атрымалі салодкія прызы.

Кіселявецкая ПБ, 32 чал.

***19 чэрвеня***

Увазе дзяцей на гульнявой праграме «Летнее настроение» прадстаўлены тэматычныя прагляды літаратуры «В гостях у сказки», «Я с книгой открываю мир природы». Прысутныя даведаліся, як з карысцю правесці час у бібліятэцы. Дзеці ўдзельнічалі ў флэшмобе «Радуга желаний», у рухавых гульнях, слухалі песні і вершы, адказвалі на пытанні віктарыны «Весёлое лето», прыгадвалі прыказкі пра лета. Самыя актыўныя ўдзельнікі атрымалі ў якасці прызоў закладкі ў кнігі.

Арэхаўская ПБ, 37 чал.

## <u>Мерапрыемствы, прысвечаные Году малой Радзімы</u>

***6 чэрвеня***

У час выступлення ЛПГ «Ветразь» «Завещано беречь нам эту землю» вядучыя чыталі вершы аб родным краі мясцовай паэткі Гарыст Л. І., рассказвалі аб экалогіі роднага края, аб гісторыі стварэння Чырвонай кнігі. Прысутныя пазнаёміліся з запаведнікамі і заказнікамі, якія дзейнічаюць у Беларусі, а таксама з заказнікам «Клішча», які знаходзіцца каля пасёлка Арэхаўскі. Прысутныя прагледзелі відэапрэзентацыю «Берегите Землю».

Арэхаўская ПБ, 22 чал.

***16 чэрвеня***

Хідрынская публічная бібліятэка прыняла ўдзел у свяце аграгарадка Хідры «З любоўю да людзей і роднай старонкі». Святочная праграма сабрала гасцей ад малога да вялікага. Прысутных са святам павіншавалі старшыня Хідрынскага сельвыканкама Пётр Назарук і настаяцель храма святога прарока Іаана Прадцечы айцец Андрэй. Бібліятэкарам арганізавана ўшанаванне самых актыўных чытачоў бібліятэкі (А. В. Мурза, сям'я Кантарук, Даша Андрэюк). Праведзены бібліяграфічны агляд выставы-прагляда «Мая малая родина, моя жизнь, моя судьба, моя любовь».

Хідрынская ПБ, 76 чал.

***21 чэрвеня***

Да 615-годдзя вёскі Грушава сумеснымі намаганнямі Гарадзецкага філіяла, Грушаўскай публічнай бібліятэкі, народнага ансамбля Гарадзецкага сельскага клуба і пры спонсарскай падтрымцы прадпрыемстваў і ўстаноў Гарадзецкага сельвыканкама праведзена свята «Деревенька моя – отчий дом». Загадчыца Гарадзецкага філіяла была вядучай мерапрыемства, а бібліятэкар Грушаўскай бібліятэкі падрыхтавала віншавальны блок для лепшых чытачоў вёскі.

Гарадзецкі філіял, Грушаўская ПБ, 320 чал.

***23 чэрвеня***

Бібліятэкары сумесна з настаўнікам нядзельнай школы арганізавалі праваслаўна-краязнаўчы паход «Да жыватворных вытокаў малой радзімы». Выхаванцы нядзельнай школы пабывалі на богаслужэнні ў храме Архістратыга Міхаіла в. Бародзічы. Айцец Георгій правёў экскурсію па царкве, пазнаёміў з яе гісторыяй. Супрацоўнікі бібліятэкі расказалі пра вёску Бародзічы, а таксама арганізавалі тур на бераг Днепра-Бугскага канала, рухавыя гульні і забавы для дзяцей, якія дазволілі ім падтрымаць фізічную форму, замацаваць і набыць турыстычныя навыкі.

Гарадзецкі філіял, 48 чал.

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

***13 чэрвеня***

У Дзівінскім філіяле прайшло чарговае пасяджэнне аматарскага клуба «Диво» - трэнінг «Аэробика для ума». Псіхолаг Юлія Гейст правяла конкурс-размінку «Делай так», гульню «Картинки», віктарыну «Узнай героя» і міні-крыжавандзінг. Удзельнікі атрымалі псіхалагічную кансультацыю. Член аматарскага клуба Сыч О. М. і бібліятэкар Т. А. Гурыш чыталі вершы і выконвалі песні. Кніжная выстава «Когда нездоровится» пазнаёміла прысутных з літаратурай па здароваму ладу жыцця і медыцынскай тэматыцы. Госці атрымалі памятныя сувеніры.

Дзівінскі філіял, 25 чал.

***13 чэрвеня***

Для навучэнцаў старэйшых класаў СШ № 6 прайшло віртуальнае падарожжа па самым незвычайным музеях свету «Глазам своим не верю!». Супрацоўнікі бібліятэкі прапанавалі прысутным пазнаёміцца з лепшымі музеямі свету з самымі нечаканымі экспанатамі: музей падгарэлай ежы, музей бульбы фры, музей хлусні, музей гарчыцы Колман, музей плюшавых мішак, музей-цела, музей смеху, музей марцыпанаў і інш.

Навучэнцы пазнаёміліся і з незвычайнымі музеямі Беларусі: музеем карэт, аптэкай-музеем, музеем землязнаўства, музеем камянёў, музеем ката і іншымі.

ЦРБ, 24 чал.

***21 чэрвеня***

У абеліска воінам-вызваліцелям у цэнтры Дзівіна з ускладання кветак да абеліску пачалася патрыятычная акцыя «Чтобы помнили...». Вядучыя расказалі пра пачатак вайны, пра цяжкія будні падлеткаў у тыле, пра іх адвагу ў партызанскіх атрадах і на фронце. Дзеці праслухалі вершы пра вайну, прагледзелі відэафрагменты ваеннай хронікі. Бібліятэкар правяла віктарыну «Мы помним, чтобы жить» і зрабіла бібліяграфічны агляд кніжнай выставы «Война глазами ребёнка».

Дзівінскі філіял, 50 чал.

***21 чэрвеня***

Пазнавальна-забаўляльная гадзіна па супрацьпажарнай бяспецы «Пожарным можешь ты не быть…» пачалася з правядзення пяціхвілінкі «Действия при пожаре». З акцыяй «Ярмарка безопасности» ў мерапрыемстве прынялі ўдзел супрацоўнікі Кобрынскага РАНС. Бібліятэкары падрыхтавалі тэматычныя загадкі, інтэлектуальную віктарыну па тэхніцы пажарнай бяспекі «Не шути с огнём!» і правялі эстафету «Полоса препятствий для юных пожарных».

Гардзецкі філіял, 63 чал.

***24 чэрвеня***

Гасцямі гадзіны прафарыентацыі «Подумаем вместе – выберешь сам» з прымяненнем гульнявых матэрыялаў «Калейдоскоп профессий» сталі навучэнцы старэйшых класаў СШ № 6 г. Кобрына. Прысутныя праслухалі інфармацыю аб разнастайных прафесіях і іх важнасці для людзей. Загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі рассказала аб прафесіі бібліятэкара і пра тое, у якіх навучальных установах можна атрымаць гэтую спецыяльнасць. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі «Путешествие по профессиям».

ЦРБ, 25 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81